**Рэкамендацыі па выкарыстанні ў адукацыйным працэсе вучэбнага дапаможніка «Беларуская мова» для 5 класа**




Да 2019/2020 навучальнага года выдадзены новы вучэбны дапаможнік «Беларуская мова» для 5 класа (*Валочка Г.М., Зелянко В.У., Мартынкевіч С.В., Якуба С.М. Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. У 2-х ч. – Мінск : НІА, 2019*).

Новы вучэбны дапаможнік падрыхтаваны ў адпаведнасці з кампетэнтнасным падыходам і накіраваны на рэалізацыю асноўных мэт моўнай адукацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі:

- засваенне ведаў пра сістэму беларускай мовы на ўсіх яе ўзроўнях (фанетычным, лексічным, фразеалагічным, марфемным і словаўтваральным, марфалагічным, сінтаксічным), заканамернасцей і правіл функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, нормаў беларускай літаратурнай мовы, фарміраванне ўменняў практычнага выкарыстання мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці;
- фарміраванне камунікатыўных уменняў на аснове авалодання маўленчай тэорыяй (тэкст, тыпы, стылі і жанры маўлення) і культурай маўлення, уменняў ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў;
- усведамленне вучнямі мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, як сродку спасціжэння айчыннай і сусветнай культуры; выпрацоўка ўменняў карыстацца культуразнаўчымі звесткамі з мэтай забеспячэння паўнавартаснай камунікацыі.

Вучэбны дапаможнік адпавядае патрабаванням, што прад’яўляюцца да падручнікаў новага пакалення.

Новы матэрыял у вучэбным дапаможніку падаецца з апорай на веды вучняў, атрыманыя імі ў пачатковых класах, і накіраваны на фарміраванне ў іх аналітычных і аналітыка-сінтэтычных уменняў і навыкаў, пазнавальных інтарэсаў, уменняў і навыкаў самастойнай працы з вучэбным тэкстам (рубрыкі «Успамінаем вывучанае», «Гавары і пішы правільна» і інш., якія вызначаюць спосабы вучэбных дзеянняў і віды дзейнасці).

Прыклад задання з рубрыкі «Успамінаем вывучанае»:

**36.** Дапоўніце звесткі пра часціны мовы. Прывядзіце прыклады.

Назоўнік — гэта часціна мовы, якая абазначае ... і адказвае на пытанні ... . Напрыклад: ... .

... — часціна мовы, якая абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні ... . Напрыклад: ... .

Займеннік — часціна мовы, якая ўказвае на асобу ці прадмет, але ... .

Дзеяслоў — гэта часціна мовы, якая абазначае ... і ... .

Прыклад задання з рубрыкі «Гавары і пішы правільна»:

Пры дзеясловах маўлення і думкі ў беларускай мове ўжываецца прыназоўнік ***пра***: *гаварыць* ***пра*** *падзеі, пагутарыць* ***пра*** *сяброў, думаць* ***пра*** *будучыню.*

У вучэбным дапаможніку выкарыстаны разнастайныя спосабы для азнаямлення з новым матэрыялам і яго засваення: індуктыўны (ад назіранняў да вывадаў); дэдуктыўны (вывад пацвярджаецца наступнымі назіраннямі); аналітычны, які дазваляе фарміраваць у навучэнцаў уменні і навыкі знаходзіць патрэбную інфармацыю, аналізаваць і інтэрпрэтаваць яе, ацэньваць і выкарыстоўваць для вырашэння пастаўленай задачы.

Вышэйсказанае можна праілюстраваць сістэмай практыкаванняў да тэмы «Умовы, неабходныя для ўспрымання і стварэння выказвання. Стылі маўлення: мэта і сфера выкарыстання»:

**16.** Прачытайце.

Усе мы ведаем, што мова — гэта найважнейшы сродак чалавечых зносін. Зносіны даюць магчымасць чалавеку расказаць пра свае патрэбы, выказаць свае пачуцці і перажыванні, падзяліцца з іншымі радасцю ці бядой, папрасіць дапамогі ці пабудзіць да дзеяння.

Але для таго каб адбыліся маўленчыя зносіны, неабходны пэўныя ўмовы.

1. Гутарка адбудзецца, калі ў ёй удзельнічаюць хоць бы два чалавекі: адрасант (адпраўнік — той, хто перадае (адпраўляе) інфармацыю) і адрасат (атрымальнік — той, хто яе атрымлівае).

2. У іх павінна быць тэма для абмеркавання.

3. Неабходна ведаць мову, на якой адбываюцца зносіны.

Ці могуць адбыцца маўленчыя зносіны, калі чалавек адзін? Колькі патрэбна людзей, каб зносіны адбыліся? Як называюць гэтых людзей?

Ці могуць адбыцца маўленчыя зносіны паміж людзьмі, якія карыстаюцца рознымі мовамі?

Ці могуць адбыцца маўленчыя зносіны паміж людзьмі, калі ім няма пра што гаварыць або няма жадання гаварыць?

*адраса́т*

*адраса́нт*

**17.** Прачытайце верш. Вызначце яго адрасата і адрасанта, мову, на якой адбываецца гутарка, і яе тэму.

Ці магла б адбыцца гутарка, калі б не былі захаваны ўмовы маўленчых зносін? Калі б не было адрасата, тэмы для гутаркі ці агульнай мовы?

Як дзяўчынка выканала просьбу? Як вы думаеце, ці ўдалося ёй намаляваць вецер?

Як бы вы намалявалі вецер?

**18.** Папрацуйце ў групах.

Заданне для 1-й групы: уявіце сабе, што вам даручылі выступіць перад аднакласнікамі з паведамленнем пра карысць фізічных практыкаванняў у жыцці чалавека. Пра што і як вы будзеце гаварыць?

Заданне для 2-й групы: уявіце сабе, што з раніцы вы робіце фіззарадку (або наведваеце, напрыклад, секцыю плавання). Паспрабуйце пераканаць свайго сябра ў карысці гэтых практыкаванняў. Пра што і як вы будзеце гаварыць?

Ці адрозніваюцца змест і моўныя сродкі вашых паведамленняў? Калі адрозніваюцца, то чаму?

**19.** Прачытайце схему. Раскажыце, ад чаго залежаць нашы выказванні.

МАЎЛЕНЧАЯ СІТУАЦЫЯ

| з кім? | дзе гаворым? | з якой мэтай? |
|---|---|---|
| • з адным чалавекам;<br>• з многімі людзьмі | • у неафіцыйных абставінах (дома, на вуліцы);<br>• у афіцыйных абставінах (у школе, на сходзе) | • паведаміць пра нешта;<br>• абмяняцца думкамі;<br>• уздзейнічаць на субяседніка |

**20.** Згрупуйце і запішыце прыклады так, каб яны ўказвалі: а) на неафіцыйныя абставіны; б) афіцыйныя абставіны.

**21.** Прачытайце тэксты. Вызначце сітуацыю, у якой кожны з тэкстаў можа быць выкарыстаны. Пра што ў іх гаворыцца? Як пра гэта паведамляецца: аднолькава ці па-рознаму?

Як вы думаеце, якія з гэтых тэкстаў можа быць выкарыстаны ў размове з сябрамі, знаёмымі, які — у навуковых выданнях (даведніках, энцыклапедыях, слоўніках), а які мы можам прачытаць у мастацкай літаратуры?

Вызначце, які з тэкстаў мае на мэце:

а) паведаміць дакладныя звесткі пра навальніцу як прыродную з'яву;

б) абмяняцца думкамі пра надвор'е;

в) перадаць словамі малюнак з'явы прыроды (навальніцы).

**22.** Прачытайце схему. Раскажыце пра стылі маўлення ў беларускай мове.

Стылі маўлення → гутарковы; кніжныя → мастацкі, навуковы, афіцыйны, публіцыстычны

Для кожнага стылю характэрны свае прыметы: мэта і сфера выкарыстання, моўныя сродкі.

**23.** Прачытайце тэкст. Пра якую кветку ў ім гаворыцца? Што дапамагло вам пазнаць яе?

Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары.

Матэрыял практыкаванняў вучэбнага дапаможніка накіраваны на рэалізацыю міжпрадметных сувязей, фарміраванне інтэлектуальнай, духоўна-маральнай, камунікатыўнай, грамадзянскай культуры вучняў.

Так, напрыклад, матэрыял практыкавання 77 накіраваны на фарміраванне духоўна-маральнай культуры вучняў.

**77.** Прачытайце тэкст, устаўляючы замест кропак патрэбныя па сэнсе займеннікі.

**Сыноўняя любоў**

Тры жанчыны бралі ваду ў калодзежы. Да ... падышлі сыны. Адзін пацалаваў сваю маці і пабег, напяваючы, далей.

Другі спытаў у маці, ці не стамілася ..., і пабег даганяць таварыша. Трэці моўчкі ўзяў вёдры і панёс ... дахаты.

Насустрач жанчынам ішоў стары чалавек:

— Скажы, мудрэц, — спыталі маці, — чый сын самы лепшы?

Стары адказаў, што ... .

Закончыце тэкст, ужываючы ў ім займеннікі. Вызначце склон займеннікаў.

Сістэма практыкаванняў вучэбнага дапаможніка накіравана на засваенне вучэбнага матэрыялу і прадугледжвае паступовае ўскладненне заданняў: ад *прапедэўтычных практыкаванняў* (узнаўленне вывучанага матэрыялу, выкананне падрыхтоўчых заданняў) да *практыкаванняў-ілюстрацый* (аналіз прапанаванага дыдактычнага матэрыялу: слоў, словазлучэнняў, сказаў, тэкстаў), *замацавальных практыкаванняў* (тлумачэнне арфаграм, падбор уласных прыкладаў, выкарыстанне вывучаных моўных з'яў у звязным маўленні), *творчых практыкаванняў* (складанне словазлучэнняў і сказаў, пераканструяванне прыкладаў, выкарыстанне моўных адзінак у творчых работах).

Напрыклад, да тэмы «Словазлучэнне» прапанавана наступная сістэма практыкаванняў:

**122.** Прачытайце спачатку ўрывак I з казкі «Шэры і Чорны». Ці можна здагадацца па імёнах, хто героі казкі? Чаму да імёнаў герояў патрэбны ўдакладненні?

Чаму з урыўка II стала зразумела, пра каго расказвае аўтар? Якія словы дапамаглі зразумець гэта?

Далучыце да назоўніка *партфель* словы, якія апісваюць яго прыметы. Якія з гэтых слоў маюць супрацьлеглыя значэнні? Як называюцца такія словы? Словазлучэнні запішыце.

Чым адрозніваецца слова ад словазлучэння?

**123.** Прачытайце верш.

Выпішыце з тэксту спалучэнні назоўніка і прыметніка. Дакажыце, што гэта словазлучэнні.

**124.** Складзіце словазлучэнні, падбіраючы да прапанаваных слоў тыя, што падыходзяць па сэнсе.

Назавіце прыметнік, ужыты ў пераносным значэнні. Растлумачце яго значэнне.

Са словазлучэннямі (на выбар) складзіце і запішыце два сказы.

**125.** Спішыце тэкст. Раскрыйце дужкі, дапасуйце прыметнікі да назоўнікаў.

Адкажыце на пытанні і запішыце тры словазлучэнні наступнай будовы: *прыметнік* + *назоўнік*:

Як называюцца паплавы, якія знаходзяцца за ракой?

Як называецца лес, з якога робяць мачты?

Як называюцца таполі, якія немагчыма абхапіць?

Вызначце лік і склон назоўнікаў і прыметнікаў.

Апішыце вядомую вам раку. Пачніце апісанне са звестак, прапанаваных у тэксце. У якасці апорных слоў выкарыстайце наступныя: *рака*, *вада*, *плынь*, *берагі*, *пратокі*, *паплавы*.

**126.** Прачытайце верш. Выпішыце з яго словазлучэнні з выдзеленымі словамі.

Знайдзіце ў вершы спалучэнні слоў, якія абазначаюць *час перад світаннем; красу, якую нельга знішчыць, якая не можа знікнуць.*

- Выпішыце з верша сінонімы да слова *гаварыць*.

Выкарыстанне ў якасці дыдактычнага матэрыялу тэкстаў – урыўкаў з твораў мастацкай літаратуры – спрыяе стварэнню на вучэбных занятках развіццёвага маўленчага асяроддзя: рашэнне моўных і маўленчых задач на аснове тэксту стварае ўмовы для фарміравання ў вучняў правільнасці маўлення (авалодання моўнымі і маўленчымі нормамі) і камунікатыўнай мэтазгоднасці маўлення (развіцця і ўдасканалення такіх камунікатыўных якасцей маўлення, як дакладнасць, лагічнасць, чысціня, багацце, выразнасць, дарэчнасць).

Заданні да тэкстаў скіраваны не толькі на выпрацоўку вучэбна-моўных уменняў і навыкаў вучняў (фанетычных, арфаграфічных, лексічных і інш.), але і на фарміраванне *чытацкай пісьменнасці* – здольнасці разумець і выкарыстоўваць пісьмовыя тэксты, разважаць пра іх і займацца чытаннем для рэалізацыі сваіх мэт, пашыраць свае веды і магчымасці, удзельнічаць у сацыяльным жыцці (згодна з міжнароднымі даследаваннямі PISA). Такія заданні патрабуюць:

– знайсці і выбраць інфармацыю;

– інтэграваць і інтэрпрэтаваць паведамленне тэксту;

– асэнсаваць і ацаніць змест або форму тэксту.

Першыя два ўменні падразумяваюць апору на тэкст, трэцяе патрабуе апоры на пазатэкставыя веды:

**52.** Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі і ставячы назоўнікі ў патрэбную форму.

Кожны, хто прыязджае пазнаёміцца з *(Беларусь)*, на развітанне з *(прыемнасць)* набывае нацыянальны сувенір. Доўгія гады ён будзе нагадваць пра гасцінны край і яго людзей.

Народнае мастацтва ў магазінах сувеніраў прадстаўлена такім *(рамяство)*, як пляценне з *(саломка)*.



Простыя ў выкананні, з двух-трох пучкоў *(салома)*, залацістыя паўліны, грывастыя коні здзіўляюць пакупнікоў *(вобразнасць)* і *(дэкаратыўнасць)*. Такіх саламяных фігурак нідзе, акрамя *(Беларусь)*, не робяць *(Паводле Я. Сахуты)*.

Вызначце, да якога скланення адносяцца словы, што ў дужках. Абазначце над словамі тып скланення (1, 2 або 3-е).

З якой мэтай людзі звычайна прывозяць сувеніры з тых краін, якія наведваюць?

Чым адметнае такое нацыянальнае рамяство беларусаў, як пляценне з саломкі?

Раскажыце пра іншыя віды беларускіх рамёстваў, якія вы ведаеце.

Моўную аснову асобных практыкаванняў складаюць фразеалагізмы, прыказкі, прымаўкі (рубрыка «Скарбы мовы»), што спрыяе ўзмацненню семантычнага аспекту пры навучанні беларускай мове, а таксама засваенню вучнямі «закадзіраваных» у фраземах і парэміях звестак пра гісторыю, духоўнае жыццё, этнічны побыт, характар беларускага народа:

**3.** Прачытайце прыказкі. Як вы разумееце іх сэнс?

1. Хто пытае, той не блудзіць.
2. Добрае слова не забываецца.
3. Куляй патрапіш у аднаго, а трапным словам — у тысячу.
4. Хто забыў сваіх продкаў — сябе губляе, хто забыў сваю мову — усё згубіў.
5. Сказаў, як жарам у вочы сыпануў.

Запішыце прыказку, якая гаворыць, што мова — гэта найважнейшы сродак зносін.

- Падкрэсліце ў ёй дзеясловы, вызначце колькасць літар і гукаў у іх.

**46.** Спішыце прыказкі і прымаўкі, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

1. Бац..каўшчыны не купляюць і не прадаюць. 2. Усякаму міла свая ра*(д/дз)*іма. 3. Усюды добра, а дома лепш за *(у/ў)*сё. 4. Няма смачнейшай ва*(д/дз)*іцы, як з роднай крыніцы. 5. Якая птушка, такое і гн..здзечка. 6. Ля сонца *(ц/т)*ёпла, ля дома добра.

- Падкрэсліце тры словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае.

Рубрыка «Гавары і пішы правільна» спрыяе развіццю культуры вуснага і пісьмовага маўлення вучняў:

Па-беларуску трэба дзякаваць не каго, а каму — *дзякую вам*; прабачаць не каго, а каму — *прабачце мне*. І пасміхацца не над кім, а з каго. І не адкрыць кнігу, а *адгарнуць, разгарнуць* (*Паводле Я. Скрыгана*).

У дапаможніку маюцца спасылкі на кампаненты вучэбна-метадычнага комплексу па вучэбным прадмеце (дадатковы матэрыял, размешчаны на электронным адукацыйным рэсурсе «Беларуская мова. 5 клас» нацыянальнага адукацыйнага партала (http: // e -vedy.adu.by/):

**140.** Выканайце тэставую работу па тэме «Сказы паводле мэты выказвання».

Вучэбны дапаможнік мае сістэму арыентацыі ў ім.

Выкарыстоўваюцца ўмоўныя абазначэнні для правядзення розных відаў разбору (фанетычнага[ф], лексічнага[л], сінтаксічнага[сн]).

Знак «*» пасля слова паказвае на тлумачэнне значэння гэтага слова ў слоўніку ў канцы дапаможніка.

Спецыяльныя знакі-сімвалы паказваюць на наяўнасць заданняў з электроннага рэсурса; дадатковых пытанняў і заданняў, накіраваных на замацаванне ведаў і ўменняў па раней вывучаных раздзелах і тэмах; заданняў, накіраваных на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў; заданняў творчага характару, накіраваных на развіццё звязнага маўлення вучняў:

— заданні, накіраваныя на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў;

● — дадатковыя пытанні і заданні, накіраваныя на замацаванне ведаў і ўменняў па раней вывучаных тэмах;

— заданні творчага характару, накіраваныя на развіццё звязнага маўлення вучняў;

— дадатковы матэрыял, размешчаны на электронным адукацыйным рэсурсе «Беларуская мова. 5 клас» (нацыянальны адукацыйны партал: http://e-vedy.adu.by).

Вучэбны дапаможнік па беларускай мове для 5 класа разлічаны на творчае выкарыстанне настаўнікамі.